**Манкевич И. П.,** кандидат юридических наук, доцент (учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет», Минск, Республика Беларусь); **Медведева Г. Б.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный технический университет», Брест, Республика Беларусь); **Нечухрин А. Н.,** доктор исторических наук, профессор (учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь); **Омельянюк А. М.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный технический университет», Брест, Республика Беларусь); **Познякевич В. Н.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Посохина Г. И.,** кандидат исторических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина», Брест, Республика Беларусь); **Рябова К. И.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Солодовников С. Ю.,** доктор экономических наук, профессор (Белорусский национальный технический университет, Минск, Республика Беларусь); **Таранова Т. С.,** доктор юридических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет», Минск, Республика Беларусь); **Функ Я. И.,** доктор юридических наук, профессор (Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь); **Шабанов В. Б.,** доктор юридических наук, профессор (Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь); **Шевлюков А. П.,** доктор экономических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации», Гомель, Республика Беларусь); **Яковчик Н. С.,** доктор экономических наук, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, заслуженный работник сельского хозяйства Республики Беларусь (Институт повышения квалификации и переподготовки кадров агропромышленного комплекса учреждения образования «Белорусский государственный аграрный технический университет», Минск, Республика Беларусь).

**МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ СЕРИИ**

**Андреева О. В.,** кандидат экономических наук, доцент (Центр стратегических исследований социально-экономического развития Юга России РГЭУ (РИНХ), Ростов-на-Дону, Российская Федерация); **Астратова Г. В.,** доктор экономических наук, кандидат технических наук, профессор, почетный работник высшего профессионального образования Российской Федерации (Уральский федеральный университет имени первого Президента России Б. Н. Ельцина, Екатеринбург, Российская Федерация); **Белянская О. В.,** кандидат юридических наук, доцент (Институт права и национальной безопасности федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина», Тамбов, Российская Федерация); **Биглова Г. Ф.,** доктор экономических наук, доцент (Институт социально-экономических исследований федерального государственного бюджетного научного учреждения «Уфимский федеральный исследовательский центр Российской академии наук», Уфа, Республика Башкортостан, Российская Федерация); **Горбатова М. А.,** кандидат юридических наук, доцент (Санкт-Петербургский институт (филиал) федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Всероссийский государственный университет юстиции (РПА Минюста России)», Санкт-Петербург, Российская Федерация); **Закирова Э. Р.,** кандидат экономических наук, доцент (Институт дополнительного образования федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Уральский государственный экономический университет», Екатеринбург, Российская Федерация); **Звирбуле А.,** доктор экономических наук, профессор (Латвийский сельскохозяйственный университет, Елгава, Латвийская Республика); **Касич А. А.,** доктор экономических наук, профессор (Киевский национальный университет технологий и дизайна, Киев, Украина); **Кузнецова Ю. А.,** кандидат экономических наук (филиал федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Кузбасский государственный технический университет имени Т. Ф. Горбачева» в г. Новокузнецке, Новокузнецк, Российская Федерация); **Матвеюк Я. Н.,** доктор юридических наук хабилитированный (Университет в Белостоке по развитию сотрудничества с университетами Восточной Европы, Белосток, Республика Польша); **Момот Т. В.,** доктор экономических наук, профессор (Харьковский национальный университет городского хозяйства имени А. Н. Бекетова, Харьков, Украина); **Одинцова Т. М.,** кандидат экономических наук, доцент (Институт финансов, экономики и управления федерального государственного автономного образовательного учреждения высшего образования «Севастопольский государственный университет», Севастополь, Российская Федерация); **Острогляд А. В.,** кандидат юридических наук, доцент (учреждение высшего образования «Университет Короля Данила», Ивано-Франковск, Украина); **Терзиев В. К.,** доктор наук (экономика), доктор наук (национальная безопасность), доктор наук (социальная деятельность) профессор (Военная академия имени Георгия Раковского, Русенский университет имени Ангела Кънчева, Русе, Болгария); **Шалаев В. П.,** доктор философских наук, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего профессионального образования «Поволжский государственный технологический университет», Йошкар-Ола, Республика Марий Эл, Российская Федерация); **Шаркова А. В.,** доктор экономических наук, профессор (федеральное государственное образовательное бюджетное учреждение высшего образования «Финансовый университет при Правительстве Российской Федерации», Москва, Российская Федерация).

© БарГУ, 2021

Репозиторий БарГУ

Professor (Educational institution "Yanka Kupala State University of Grodno", Grodno, the Republic of Belarus); **Omelyanyuk A. M.,** PhD in Economics, Associate Professor (Educational institution "Brest State Technical University", Brest, the Republic of Belarus); **Poznyakevich V. N.,** PhD in Economics, Associate Professor (Educational institution "Baranovichi State University", Baranovichi, the Republic of Belarus); **Posohina G. I.,** PhD in History, Associate Professor (Educational institution "Brest State A.S. Pushkin University", Brest, the Republic of Belarus); **Ryabova K. I.,** PhD in Economics, Associate Professor (Educational institution "Baranovichi State University", Baranovichi, the Republic of Belarus); **Solodovnikov S. Yu.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Educational institution "Belarusian National Technical University", Minsk, the Republic of Belarus); **Taranova T. S.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belorussian State Economic University, Minsk, the Republic of Belarus); **Funk Ya. I.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belarusian State University, Minsk, the Republic of Belarus); **Shabanov V. B.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belarusian State University, Minsk, the Republic of Belarus); **Shevlyukov A. P.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Educational institution "The Belarusian Trade and Economics University of Consumer Cooperation", Gomel, the Republic of Belarus); **Yakovchik N. S.,** Doctor of Economic Sciences, Doctor of Agricultural Sciences, Professor, Honored Worker of Agriculture of the Republic of Belarus (Professional Development and Retraining Institute of Agribusiness Specialists of Educational institution "Belarusian State Agrarian Technical University", Minsk, the Republic of Belarus).

**INTERNATIONAL EDITORIAL BOARD**

**Andreeva O. V.,** PhD in Economics, Associate Professor (the Center for Strategic Studies of Socio-Economic Development of the South of Russia RSUE, Rostov-on-don, Russian Federation); **Astratova G. V.,** Doctor of Economic Sciences, PhD in Technical Sciences, Professor, Honored Worker of High Professional Education of Russian Federation (Ural Federal University named after the first President of Russia B.N. Yeltsin, Yekaterinburg, Russian Federation); **Belyanskaya O. V.,** PhD in Law, Associate Professor (the Institute of Law and National Security of Derzhavin Tambov State University, Tambov, Russian Federation); **Biglova G. F.,** Doctor of Economic Sciences, Associate Professor ( the Institute of Socio-Economic Studies of the Federal State Budgetary Institution of Science "Ufa Federal Research Center of the Russian Academy of Sciences", Ufa, Bashkortostan, Russian Federation); **Gorbatova M. A.,** PhD in Law, Associate Professor (Saint Petersburg Institute (Branch) of Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "All-Russian State University (RLA of the Ministry of Justice of Russia", Saint Petersburg, Russian Federation); **Zakirova E. R.**, PhD in Economics, Associate Professor (the Institute of Continuing Education of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "Ural State Economic University", Yekaterinburg, Russian Federation); **Zvirbule A.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Latvia University of Agriculture, Jelgava, Republic of Latvia); **Kasich A. A.**, Doctor of Economic Sciences, Professor (Kyiv National University of Technologies and Design, Kyiv, Ukraine); **Kuznetsova Yu. A.,** PhD in Economics (the Branch of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education "T. F. Gorbachev Kuzbass State Technical University in Novokuznetsk", Novokuznetsk, Russian Federation); **Matveyuk Ya. N.,** Doctor of Legal Sciences hab. (Bialystok University for the Development of Cooperation with Universities of Eastern Europe, Bialystok, Republic of Poland); **Momot T. V.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (A.N. Beketov National University of Urban Economy in Kharkiv, Kharkiv, Ukraine); **Odintsova T. M.,** PhD in Economics, Associate Professor (Institute for Finance, Economics and Management of the Federal State Autonomous Educational Institution of Higher Education "Sevastopol State University", Sevastopol, Russian Federation); **Ostroglyad A. V.,** PhD in Law, Associate Professor (Higher Educational Institution "King Danila University", Ivano-Frankivsk, Ukraine); **Terziev V. K.,** D.Sc. (Economics), D.Sc. (National Security), D.Sc. (Social Activities), Professor (Military Academy "G. S. Rakovski", the University of Ruse "Angel Kanchev", Rousse, Bulgaria); **Shalaev V. P.,** Doctor of Philosophical Sciences, Professor (the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Professional Education "Volga State University of Technology", Yoshkar-Ola, the Mari El Republic, Russian Federation); **Sharkova A. V.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (the Federal State Educational Budgetary Institution of Higher Education "Financial University under the Government of the Russian Federation", Moscow, Russian Federation).

© BarSU, 2021

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ И АРХЕОЛОГИЯ


**Булаты П. Ю.** Вызначэнне і раскрыццё тэрміну «тытулярная традыцыя» ў кантэксце гісторыі Вялікага княства Літоўскага 6

**Загідулін А. М.** Праблема наймення беларускіх і ўкраінскіх зямель у складзе Польшчы (1921—1939) у сучаснай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі 12

**Ирха Е. М.** П. Н. Жукович о религиозно-политической борьбе в Речи Посполитой в первой трети XVII века 18

**Кейко Ю. В.** Деятельность церковных советов и приходских попечительств по организации православного храмового строительства на территории Беларуси (1864—1890) 24

**Котусев Е. Н.** Фундаментальные идеи российской исторической полонистики и их преломление в творчестве Н. Н. Любовича 30

**Кривуть В. И.** Гарнизон «Барановичи» и реализация официальной молодежной политики в межвоенный период 45

**Куньпэн Х.** Сотрудничество Китая и Всемирной организации здравоохранения в постэпидемическую эпоху (COVID-19) 50

**Некрашевич Ф. А.** Проявления коррупции при проведении рекрутских наборов в белорусских губерниях Российской империи (1831—1856) 54

**Обелевский А. А.** Эволюция нормативно-правовой базы в сфере физической культуры и спорта Республики Беларусь 59


### ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Богдан Я. А.** Апробация методики оценки эффективности управления инвестициями в человеческий капитал в организации в условиях инновационной экономики (на примере ОАО «Светлогорск-Химволокно») 65

**Дербинская Е. А.** Методика оценки конкурентоспособности национальной системы высшего образования 72

**Климук В. В.** Исследование факторов активизации инновационного наукоемкого молодежного предпринимательства 80

**Лабун Д. В.** Теория ограничения систем как современная концепция управления для повышения эффективности организации в контексте формирования экономической безопасности 90

**Пономарева М. С.** Управленческий учет затрат (расходов) и доходов от реализации товаров при предоставлении маркетинговых инструментов стимулирования продаж 97

**Рябова К. И.** Динамика воспроизводства научных кадров высшей квалификации как фактора накопления интеллектуального капитала в Республике Беларусь 103

**Терзиев В. К.** Социальное развитие и изучение социальной эффективности 110

**Шах А. В., Колбаско И. В.** Проектирование и оптимизация маркетинговых бизнес-процессов (на примере ООО «Бизнес энд Рост») 120


### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ


**Ананич С. М.** Общая совместная собственность супругов: актуальные вопросы определения состава общего имущества 126

**Богустов А. А.** Вопросы коллизионно-правового регулирования в проектах гражданского кодекса СССР 136

**Трушко М. А.** Фирменное наименование и другие средства индивидуализации участников гражданского оборота: соотношение и основные принципы разрешения конфликтов 141


## CONTENTS

### HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY


6 **Bulaty P.** The definition and disclosure of the term "titular tradition" in the context of the history of the Grand Duchy of Lithuania

12 **Zahidulin A. M.** The problem of naming of Belarusian and Ukrainian lands within Poland (1921—1939) in modern Belarusian and Ukrainian historiography

18 **Irkha E. M.** P. N. Zhukovich on the religious and political struggle in the Polish-Lithuanian Commonwealth in the first third of the XVII century

24 **Keiko Yu. V.** The activity of church councils and parish trustees in organizing orthodox church construction on the territory of Belarus (1864—1890)

30 **Kotusev E. N.** Fundamental ideas of Russian historical Polonistics and their refraction in the works of N. N. Lyubovich

45 **Krivut V. I.** Garrison "Baranovichi" and realization of official youth policy during the interwar period

50 **Kunpeng H.** Cooperation between China and the World health organization in the post-epidemic era (COVID-19)

54 **Nekrashevich P. A.** Corruption manifestations during recruitment in the belarusian governorates of the Russian empire (1831—1856)

59 **Obelevskiy A. A.** Evolution of the regulatory and legal framework in the sphere of physical culture and sport of the Republic of Belarus


### ECONOMICS


65 **Bogdan Ya. A.** Approbation of the methodology of the effectiveness of the human capital investment management in the organization under the innovative economy (on the example of OJSC "Svetlogorsk-Khimvolokno")

72 **Derbinskaya E. A.** Methodology for assessing the competitiveness of the national higher education system

80 **Klimuk V. V.** The study of factors activating innovative science-intensive youth entrepreneurship

90 **Labun D. V.** Theory of constraints as a modern management concept for increasing the efficiency of the organization in the context of forming economic security

97 **Ponomareva M. S.** Management accounting of costs (expenses) and income from the sale of goods when providing marketing tools to stimulate sales

103 **Ryabova K. I.** Dynamics of the reproduction of highly qualified scientific staff as a factor of the accumulation of intellectual capital in the Republic of Belarus

110 **Terziev V. K.** Social development and social efficiency study

120 **Shakh A. V., Kolbasko I. V.** Design and optimization of the marketing business processes of the organization (on the example of Business & Rost LLC)


### LAW


126 **Ananich S. M.** Common joint property of spouses: topical issues of determining the composition of common property

136 **Bogustov A. A.** Conflict-of-laws issues in the projects of the civil code of the USSR

141 **Trushko M. A.** Trade name and other means of individualization of participants in civil commerce: ratio and basis of conflict resolution


Репозиторий БарГУ

УДК 94(476)

**П. Ю. Булаты,** кандыдат гістарычных навук
Інстытут менеджменту спорту і турызму ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры», пр-т Пераможцаў, 105, 220020 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 576 03 86, pawelbulaty@gmail.com

# ВЫЗНАЧЭННЕ І РАСКРЫЦЦЁ ТЭРМІНУ «ТЫТУЛЯРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ» Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Артыкул прысвечаны разгляду і вызначэнню тэрміна «тытулярная традыцыя» ў дачыненні да спецыфікі грамадскіх інстытутаў Вялікага княства Літоўскага. Асаблівая роля ў грамадскім жыцці Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVIII стагоддзях адводзілася прадстаўнікам магнацкага саслоўя. Са з'яўленнем замежных тытулаў Святой Рымскай імперыі на землях Вялікага княства Літоўскага ў XVI стагоддзі ў сістэме магнацкага землеўладання з'явіліся буйныя тытулярныя маёнткі. Ідэйнае напаўненне тытулярных маёнткаў непарыўна звязана з семантычным напаўненнем тытулаў асабістых. Вызначэнне адметнасці тытулярнай традыцыі ў сацыяльнай структуры Вялікага княства Літоўскага дазволіць па-новаму зірнуць на тагачасныя культурныя працэсы і ступень іх інтэграцыі ў агульнаеўрапейскія культурныя працэсы, дзе тытулярная традыцыя трывала замацавалася ў структуры грамадства.

**Ключавыя словы:** тытулы; традыцыя; знаць; тэрміналогія; Вялікае княства Літоўскае.
Бібліягр.: 9 назваў.

**P. Bulaty,** PhD in History
Institute of Sports Management and Tourism of the Belarusian State University of Physical Culture, 105 Peramozhtsau Ave., 220020 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (29) 576 03 86, pawelbulaty@gmail.com

# THE DEFINITION AND DISCLOSURE OF THE TERM "TITULAR TRADITION" IN THE CONTEXT OF THE HISTORY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

The article is devoted to the consideration and definition of the term "titular tradition" in relation to the specifics of public institutions of the Grand Duchy of Lithuania. Representatives of the magnate class played a special role in the public life of the Grand Duchy of Lithuania in the 16th and 18th centuries. With the emergence of foreign titles of the Holy Roman Empire in the lands of the Grand Duchy of Lithuania in the XVI century, large titular estates appeared in the system of magnate land ownership. The ideological content of titular estates is inextricably linked with the semantic content of personal titles. Defining the essence of the titular tradition in the social structure of the Grand Duchy of Lithuania will allow a new look at the cultural processes of that time and the degree of their integration into European cultural processes, where the titular tradition is firmly established in society.

**Key words:** titles; tradition; elite; terminology; Grand Duchy of Lithuania.
Ref.: 9 titles.

**Уводзіны.** У розных грамадскіх сістэмах тытулы ва ўсе гістарычныя эпохі з'яўляліся адметным сацыяльным феноменам, неслі ў сабе адбітак свайго грамадства і свайго часу. Праз тытулы адлюстроўваўся «сацыяльны твар» гістарычнага перыяду і пануючай палітычнай сістэмы. Тытулы — свайго роду лакатары для вызначэння развіцця самага грамадства. Ак-

© Булаты П. Ю., 2021



Рэпазіторый БарДУ

туальнасць і значэнне вывучэння сацыяльных з’яў, звязаных з тытуламі, заключаецца ў тым, што прынцыпы і прычыны ўзнікнення тытулаў, эвалюцыя ў іх успрыманні і значэнні дазваляюць усебакова прадставіць гістарычны працэс, наблізіцца да разумення светапогляду чалавека з мінулага, раскрыць заканамернасці яго мыслення, сэнс учынкаў, наблізіцца да вывучэння сацыяльнай псіхалогіі элітарных груп грамадства, іх менталітэту. Усе адзначаныя з’явы ў спалучэнні з тытуламі можна акрэсліць тэрмінам «тытулярная традыцыя». Даць гэтаму тэрміну вызначэнне і раскрыць асаблівасць яго ўжывання для часоў Вялікага княства Літоўскага — мэта прадстаўленага даследавання.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Сам тэрмін «тытулярная традыцыя» не вылучаўся ў гістарычных даследаваннях альбо сумежных гуманітарных дысцыплінах. Працэс вызначэння тэрміну «тытулярная традыцыя» заключаецца ў тэарэтычных пошуках і высновах з назапашаных ведаў. Зыходзячы з гэтага і акрэсленай мэты вынікаюць выкарыстаныя намі матэрыялы даследавання: напрацоўкі гістарыяграфіі па тытулярнай тэматыцы і тэарэтычныя вызначэнні сумежных дысцыплін, якія прысвечаны тэме тытулаў і традыцыі.

Праблематыка развіцця і фарміравання айчыннай тытулярнай традыцыі вызначаецца як комплексная. Вырашэнне галоўных пытанняў залежыць ад вырашэння шэрагу пытанняў лакальных, якія ахопліваюць розныя напрамкі гістарычных даследаванняў. Падрабязны разгляд гістарыяграфіі, які прысвечаны аспектам тытулярнай традыцыі, выходзіць за межы дадзенага даследавання (намі ён праводзіўся і прадстаўлены ў нашай працы «Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў XVI—XVIII ст.» [1]). Агульныя ж высновы акрэслім.

Даследчыя напрацоўкі, у якіх адлюстроўваюцца і закранаюцца пытанні развіцця тытулярнай традыцыі на беларускіх землях перыяду XI—XVI стагоддзяў, з’яўляюцца грунтоўнымі і аб’ёмнымі. На іх падставе ўяўляецца магчымым сістэматызаваць і сфарміраваць бачанне развіцця тытулярнай традыцыі адзначанага перыяду, дакладна вызначыць сацыяльную глебу, на якую прыўносіліся ў XVI стагоддзі тытулы са Святой Рымскай імперыі. Актуальны стан гістарыяграфіі ў пытанні ролі тытулаў у грамадстве Вялікага княства Літоўскага адзначаецца недастатковай распрацаванасцю шэрагу ключавых момантаў. Так, маюцца лакуны ў вызначэнні этымалогіі і шляхоў з’яўлення на беларускіх землях тытулаў Святой Рымскай імперыі. Недастаткова раскрытыя прычыны ўзнікнення замежных тытулаў, іх роля, значэнне і ўспрыманне, а таксама разуменне іх сэнсавага напаўнення ў Вялікім княстве Літоўскім. Не акрэсленая роля ўласных тытулаў у сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным жыцці краіны. Часткова напаўненне адзначаных прабелаў магчымае на падставе існуючых сумежных гістарычных напрацовак беларускіх і замежных даследчыкаў (працы па гісторыі дыпламатыі; даследаванні, прысвечаныя магнатэрыі; генеалагічныя і геральдычныя напрацоўкі).

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстоўваліся агульнанавуковыя і спецыяльныя гістарычныя метады даследавання.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Тэрмін «тытулярная традыцыя», як можна заўважыць, складаецца з дзвюх састаўных самастойных элементаў: «тытул» і «традыцыя». Каб вызначыцца з выніковым вызначэннем мэтавай дэфініцыі, звернем увагу на прыватныя часткі агульнага тэрміна.

*Тытул.* Акрэслены тэрмін мае шмат значэнняў і ўжыванне у розных навуковых сферах: эканоміцы, агульнай юрыспрудэнцыі, маёмасным праве. У кантэксце нашага даследавання мы звяртаем увагу на вызначэнне тэрміну «тытул», які ўжываецца ў грамадскіх адносінах.

Слова «тытул» мае лацінскія карані і паходзіць ад *titulus* — надпіс, назва, ганаровае званне. Згодна з энцыклапедычным слоўнікам Ф. Бракгаўза і І. Ефрона, у старажытных рымлян тытулам называўся любы кароткі надпіс, аб’ява альбо цэтлік на бытавым прадмеце, прадметах продажу, на храмах, статуях, будынках, надмагіллях [2, с. 258]. У слоўніку лацінскіх слоў тэрмін *titulus* мае наступныя значэнні і прыклады ўжывання (акрэслім важныя для кан-



Репозиторий БарГУ

тэксту нашага даследавання): 1) надпіс (rerum gestarum titulus — надпіс з пералікам подзвігаў); 2) надмагільны надпіс, эпітафія (titulus sepulcri); 3) ганаровае званне, слаўнае імя, гонар, годнасць, слава (titulus captae urbis — гонар узяцця гораду); 4) подзвіг, заслугі (per titulos alicujus ingredi — усхваляць чыйсьці подзвіг) [3].

У антычным значэнні ганаровага звання тэрмін «тытул» перайшоў у эпоху Сярэднявечча, дзе тытулы пашырыліся і сталі маркерам фарміравання іерархічнай структуры грамадства. У гэтым значэнні «тытул» можна вызначыць як пажыццёвае, спадчыннае альбо нададзенае ганаровае родавае званне, якое было замацавана за асобай высокага сацыяльнага стану [4, с. 98]. У дадзеным падыходзе для нас важнымі будуць тыя ўласцівасці, які характарызуюць тытулы: *пажыццёвасць* (наданне тытула без вызначэння часовых абмежаванняў, гэтым тытулы адрозніваюцца ад пасад, якія маюць вызначаную кадэнцыю); *спадчыннасць* (права перадаць тытул нашчадкам альбо атрымаць яго па факце ўласнага нараджэння); *родавасць* (тытул распаўсюджваецца на прадстаўнікоў усяго роду); *магчымасць атрымання* (кола носьбітаў тытулаў не закрытае, тытул можна атрымаць пры пэўных умовах). У такім значэнні тытул выступае як інструмент падкрэслівання асаблівага, прывілеяванага становішча яго носьбіта.

На тытул у вузкім значэнні ганаровага родавага альбо нададзенага звання ўвагу звярталі даследчыкі, якія вывучаюць ролю тытулаў у сацыяльных адносінах. Так, паводле гісторыка Л. Шэпелева, тытул — гэта ўстаноўленае законам славеснае вызначэнне службовага становішча іх носьбітаў, якое коратка вызначае іх прававы статус [5, с. 3]. Блізкай па значэнні і больш лаканічнай фармулёўкі прытрымліваецца даследчык Г. Мурашоў. Паводле яго высновы, тытул — гэта ўстаноўленыя законам славесныя вызначэнні службовага і саслоўна-родавага становішча іх носьбітаў [6, с. 3]. У гэтым кантэксце пры разглядзе тытулаў акцэнт робіцца на іх фармальных прыкметах: статус тытула акрэсліваецца законам, адпаведна, кожны тытул мае набор сацыяльных пазіцый (магчымасцей, прывілеяў), чым вызначаецца строгі прававы статус яго носьбіта. Тут будзе дарэчным звярнуць увагу на канкрэтны гістарычны прыклад. Так, у Святой Рымскай імперыі існавала складаная іерархія тытулаў, у якую ўваходзілі і тытулы імперскія. Апошнія давалі іх носьбітам права голасу ў Рэйхстагу. Гэта значыць, імперскія тытулы давалі іх носьбітам канкрэтныя палітычныя правы [1, с. 35].

Звернем увагу на падыход да вызначэння тэрміну «тытул», які акрэсліў амерыканскі даследчык К. Раффэнспэргер. У сваім вызначэнні гісторык не паглыбляецца ў доўгія фармулёўкі, ён лаканічна акрэслівае, што тытул — гэта важны індыкатар статусу [7, с. 179]. Даследчык тлумачыць: калі мы пералічваем людзей, тытулы становяцца спосабам ранжыравання і вызначэння найбольш магутных (уплывовых) сярод сяброў, ворагаў, саюзнікаў, суседзяў [7, с. 179]. На нашу думку, падобны падыход злучае ўласцівасці тытула і яго фармальны бок. Праз вызначэнне «важны індыкатар статусу» перадаецца функцыя тытула як інструмента вызначэння адметнага становішча, а таксама яго прававое напаўненне.

*Традыцыя.* У канструкце «тытулярная традыцыя» першасная (галоўная) частка — «традыцыя», другасная — «тытул». Традыцыя — глабальная з’ява, тытул у сістэме традыцыі — з’ява лакальная, падпарадкаваная. Пры разглядзе паняцця «традыцыя» мы імкнёмся даць адказ на пытанне: ці ёсць месца тытулам у гэтай сацыякультурнай з’яве?

Тэрмін «традыцыя» досыць распаўсюджаны, яго вызначэнне добра распрацавана ў навуковых апаратах розных дысцыплін. Для нашага даследавання важнымі будуць тыя напрацоўкі, якія былі назапашаны ў філасофіі і сацыялогіі.

Тэрмін «традыцыя» паходзіць з лацінскай мовы (tradition — перадача, паданне) і вызначаецца тым, што гэта ўніверсальная форма фіксацыі, замацавання і выбарчага захавання тых ці іншых элементаў сацыякультурнага досведу, а таксама ўніверсальны механізм яго перадачы, які забяспечвае ўстойлівую гістарычную пераемнасць у сацыякультурных працэсах. Тым самым традыцыя ўключае ў сябе тое, што перадаецца, і тое, як ажыццяўляецца гэта перадача [8, с. 841—842]. У прыведзеным вызначэнні звернем увагу на словазлучэнне «сацыякультурны досвед», які, па-сутнасці, з’яўляецца ці ж не самым ключавым у вызначэнні традыцыі.

Так, сацыякультурны досвед — гэта важная змястоўная кампанента культуры, якая з'яўляецца гістарычна адабранай і замацаваўшайся у грамадскай свядомасці формай ажыццяўлення любой сацыяльна значнай дзейнасці. Паставім пытанне: ці ўпісваецца «тытул» у дэфініцыю «сацыякультурны досвед»? На нашу думку, упісваецца. Абумоўлена гэта тым, што тытул — маркер сацыяльнага статусу. Лагічна заключыць, што крытэрыі вызначэння сацыяльнага палажэння будуць з'яўляцца сацыяльна значнай дзейнасцю. Адпаведна, тытулы і ўсё, што з імі звязана, — гэта сацыякультурны досвед.

Да вышэйсказанага дададзім важную акалічнасць. Дзеля таго, каб сацыякультурны досвед быў уключаны ў сістэму традыцыі, ён павінен прайсці адбор на ўстойлівасць і адносную масавасць ужывання ў структурах дзейнасці [8, с. 841—842]. Пры выкананні гэтай умовы досвед стане традыцыяй. На нашу думку, тытулы, як усеагульная з'ява, цалкам адпавядаюць сфармуляванай акалічнасці. Тытулы існуюць даўно і ў розных грамадскіх сістэмах (англійскае пэрства, імперскія тытулы Святой Рымскай імперыі, тытулы старажытнай Візантыі і інш.), іх ужыванне мае масавы ўніфікаваны характар. Гэта значыць, што тытулы, з'яўляючыся сацыякультурным досведам, прайшлі гістарычную селекцыю, прадэманстравалі ўстойлівасць і распаўсюджанне ў адносна шырокіх колах грамадства (найперш сярод элітарных станаў). Адпаведна, тытулы могуць спалучацца з традыцыяй і фармаваць адметную, лакальную яе форму — тытулярную традыцыю.

Такім чынам, мы можам зрабіць падагульненне і даць вызначэнне тэрміну «тытулярная традыцыя». Тытулярная традыцыя — гэта ўнармаваныя элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення, захоўваюцца ў грамадстве і ўплываюць на нормы сацыяльных узаемаадносін на працягу доўгага часу. Тытулярная традыцыя мае свае элементы і формы праяўлення, якія, аднак, не носяць універсальны характар. Для кожнай адасобленай сістэмы, якой з'яўляецца асобнае грамадства і пад уплывам якога фарміруецца і развіваецца тытулярная традыцыя, будуць свае, адрозныя ад іншых гэтай самай традыцыі элементы. Калі казаць папросту, то кожнае грамадства, якое мае тытулярную традыцыю, напаўняе яе сваімі ўласнымі сэнсамі і архетыпамі.

*Тытулярная традыцыя Вялікага княства Літоўскага.* Як мы адзначалі вышэй, галоўная мэта прадстаўленага даследавання — раскрыць асаблівасць ужывання тэрміну «тытулярная традыцыя» для часоў Вялікага княства Літоўскага. Адпаведна, мы не будзем факталагічна характарызаваць тытулярную традыцыю Вялікага княства Літоўскага (гэта досыць аб'ёмная даследчая тэма), мы пабудуем канструкт з яе элементаў.

Важна адзначыць істотную акалічнасць: адносная вага тытулярнай традыцыі ў той ці іншай грамадскай сферы розная, што дазваляе ахарактарызаваць яе як дынамічную і гнуткую. У розныя гістарычныя перыяды і ў розных грамадскіх сферах яна развівалася пад уплывам сацыяльных змен, істотна залежала ад палітычнай і грамадскай кан'юнктуры. У прымяненні да сацыяльнай сістэмы Вялікага княства Літоўскага перыяду XIII—XVIII стагоддзяў вылучым дзве ўмоўныя сферы, у якіх мае месца быць тытулярная традыцыя: сфера яе праяўлення і сфера яе ўплыву.

Пад *сферай праяўлення* тытулярнай традыцыі мы разумеем тыя сацыяльныя плоскасці, у якіх замацаваліся тытулы, сфарміраваўся рэгламент іх ужывання. Для грамадства Вялікага княства Літоўскага фіксуюцца тытулы, якія прымяняліся для асоб (асабістыя тытулы), і тытулы, якія мелі дачыненне да формаў землеўладання (тытулы маёнткаў).

Пры разглядзе асабістых тытулаў важна мець на ўвазе, што ў дачыненні да Вялікага княства Літоўскага мелі месца два тытулярныя інстытуты: тытулы манарха (аб фарміраванні манаршай тытулатуры можна даведацца з даследавання гісторыка А. Дзярновіча «Рэгаліі Літвы: што ўзнікла спачатку — вялікі князь ці Вялікае Княства?» [9]) і тытулы знаці.

У традыцыі ўжывання асабістых тытулаў, якая сфарміравалася на землях Вялікага княства Літоўскага, разнастайныя асабістыя саслоўныя тытулы не набылі такога вялікага распаўсюджвання, як у краінах Заходняй Еўропы, дзе тытулярная лесвіца мела складаную саслоўную іерархію. Галоўная адметнасць развіцця айчыннай набілітацыі заключалася ў тым,

Рэпазіторый БарДУ

што ў перыяд IX—XV стагоддзяў, калі адбывалася яе фарміраванне і ўсталяванне, ужывалася толькі адзіная форма тытулавання — князь. І толькі ў XVI стагоддзі на землях Вялікага княства Літоўскага з'яўляюцца іншыя тытулы — граф і князь Святой Рымскай імперыі. Яскравы прыклад асабістага тытула — тытул Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі: «князь на Алыцы і Нясвіжы, граф на Шыдлоўцы і Міры».

Для абазначэння праяўлення тытулярнай традыцыі ў сферы зямельнага ўладання выкарыстаем тэрмін «тытулярны маёнтак». Пад ім разумеецца ўладанне, якое мае дакументальна зафіксаваны ганаровы тытул: графства, княства (Нясвіжскае княства, Ляхавіцкае графства, Быхаўскае графства і інш.). У шэрагу краін Заходняй Еўропы і ў Вялікім княстве Літоўскім ганаровае, спадчыннае альбо нададзенае званне мела канкрэтна вызначаную геаграфічную лакалізацыю. Як правіла, акрэслівалася яно маёнткам, падуладным носьбіту ганаровага тытула. Адметнасць тытулярнага маёнтка заключалася перш за ўсё ў бюракратычнай сферы.

Пад *сферай уплыву* тытулярнай традыцыі разумеюцца тыя грамадскія сферы, на функцыянаванне якіх уплывалі тытулы, дзе менавіта тытулы сталі прычынай адметнасці. Для грамадства Вялікага княства Літоўскага мы вылучылі тры асноўныя сферы ўплыву тытулаў (сфера ўплыву тытулярнай традыцыі — пытанне адкрытае і дыскусійнае, вылучаныя намі сферы не канчатковыя, могуць быць яшчэ дапоўнены):

1) формула наймення. Пад гэтым мы разумеем прынятую і дакладна акрэсленую ўнармаваную форму ўжывання тытулаў. Іншымі словамі, тытулы ўплываюць на тое, як людзі аднаго грамадства звяртаюцца адзін да аднаго. Пры наяўнасці тытула выбудоўваецца формула наймення асобы ў адпаведнасці з яе ганаровым саслоўным званнем і становішчам. Тытул у формуле наймення фіксуе этычную і сітуацыйную норму карэктнага публічнага прадстаўлення асобы альбо звароту да яе. Тытулярная формула наймення можа складацца з аднаго ці некалькіх слоў, якія ўжываюцца перад уласным імем носьбіта тытула. Таксама адзначым, што тытулярная формула выкарыстоўваецца як пры вусных зносінах, так і ў пісьмовых камунікацыях;

2) візуалізацыя статусу. Наяўнасць тытула ўплывае на родавую геральдыку. Графскі альбо княжацкі тытул уносіць карэктывы ў геральдыку, з'яўляюцца адпаведныя тытулу элементы (як правіла, гэта кароны). Акрамя таго, візуалізацыя тытулу (а разам з ім і статусу) можа адбывацца шляхам увасаблення свайго ўласнага імя праз жывапіс (як прыклад, сармацкі партрэт з подпісам, дзе фіксуецца поўны тытул асобы, выяўленай на ім) і пасмяротныя помнікі, эпітафіі;

3) сацыяльны капітал. Маюцца на ўвазе сацыяльныя сувязі і элементы, якія могуць выступаць рэсурсам атрымання выгод. Калі разглядаць тытул як сацыяльны капітал, то трэба адказаць на галоўнае пытанне: ці можа тытул быць рэсурсам, які можа прыносіць яго носьбіту сацыяльныя прэферэнцыі? Адпаведна, ад «вагі» тытула ў сацыяльным капітале залежыць узровень матывацыі для яго атрымання, вызначаецца «каштоўнасць» тытула ў грамадстве.

**Заключэнне.** Намі вызначана, што *тытулярная традыцыя* — гэта ўнармаваныя элементы сацыяльнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення, захоўваюцца ў грамадстве і ўплываюць на нормы сацыяльных узаемаадносін на працягу доўгага часу. Для кожнай адасобленай сістэмы тытулярная традыцыя мае свае адрозныя элементы і формы праяўлення. У прымяненні да сацыяльнай сістэмы Вялікага княства Літоўскага перыяду XIII—XVIII стагоддзяў прасочваецца *сфера праяўлення* (асабістыя тытулы знаці і манарха, тытулы маёнткаў) і *сфера ўплыву* тытулярнай традыцыі (формула наймення, візуалізацыя статусу, сацыяльны капітал).

Прыведзеная мадэль — спроба пабудовы тэарэтычнага канструкту тытулярнай традыцыі ў прымяненні да грамадства Вялікага княства Літоўскага. Далейшыя эмпірычныя (археаграфічныя і гістарыяграфічныя) даследаванні змогуць напоўніць мадэль неабходнай факталагічнай масай.

Рэпазіторый БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Булаты, П. Ю.* Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў (XVI—XVIII ст.) / П. Ю. Булаты. — Мінск : БДУФК, 2020. — 217 с.
2. Titulus // Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. — СПб., 1901. — Т. XXXIII (65). — С. 258.
3. Латинско-русский словарь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/latin_rus /43836/titulus . — Дата доступа: 08.09.2021.
4. Титул // Большая энциклопедия. — М. : Терра, 2006. — Т. 51. — С. 98.
5. *Шепелев, Л. Е.* Титулы, мундиры, ордена в Российский империи / Л. Е. Шепелев ; АН СССР. — Л. : Наука, 1991. — 222 с.
6. *Мурашев, Г. А.* Титулы, чины, награды / Г. А. Мурашев. — СПб. : Полигон, 2000. — 349 с.
7. *Федосов, А. В.* Королевство Русь / А. В. Федосов, К. Раффенспергер. — М. : Центрполиграф, 2021. — 254 с.
8. Традиция // Большой энциклопедический словарь: философия, социология, религия. — Минск, 2002. — С. 841—842.
9. *Дзярновіч, А. І.* Рэгаліі Літвы: што ўзнікла спачатку — вялікі князь ці Вялікае Княства? / А. І. Дзярновіч // Фрэскі гісторыі : артыкулы і эсэ па гісторыі і цывілізацыі Беларусі і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. — Мінск : РІВШ, 2011. — С. 24—63.


Паступіў у рэдакцыю 09.09.2021.

Репозиторий БарГУ